УДК 39: 638.1(476)(091) «19/20»

# ПЧАЛЯРСТВА ЯК КУЛЬТУРНАЯ ФОРМА ЛЕСАКАРЫСТАННЯ БЕЛАРУСАЎ У ХХ – ПАЧАТКУ ХХІ СТ.

***А.Ю. БАБІЧ***
*Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны**. На працягу стагоддзяў пчалярства існавала і развівалася выключна як лясны промысел. Сувязь з лесам выяўляецца ў этымалогіі слова *пасека*, якое ўтрымлівала шырокі спектр значэнняў, у тым ліку – ’поле на месцы расчышчанага лесу’, ’поле ў лесе’, ’невялікая купа дрэў або гай у полі’, ’месца, дзе нядаўна быў высечаны лес’, ’папялішча’. Праславянская форма слова пасека *po–sěka* вытворнае ад *po–sěkti* ’пасячы’ – першапачаткова азначала высечаныя кусты, якія спальвалі і на іх месцы рабілі поле, пазней стала выкарыстоўвацца для абазначэння расчышчанага месца для вулляў [1, с.179].

Звесткі, якія адлюстроўваюць асаблівасці і стан ляснога пчалярства напрыканцы ХІХ – пачатку ХХ ст. у розных гісторыка–этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, змешчаны ў працах А. Сержпутоўскага, Ч. Пяткевіча, К. Машынскага (Палессе), М. Нікіфароўскага (Падзвінне), Е. Раманава (Падняпроўе). Варта адзначыць, што большасць матэрыялаў па дадзенай праблематыцы сабрана даследчыкамі на Палессі. Выключную ролю для вывучэння традыцый пчалярства мае даследаванне А. Сержпутоўскага «Бортничество в Белоруссии» (1914). На падставе матэрыялаў, сабраных А. К. Сержпутоўскім напрыканцы ХІХ ст. і падчас экспедыцый 1906 – 1910 гг., зроблена дэтальнае апісанне прыёмаў і прылад, якімі карысталіся беларусы пры развядзенні дзікіх і хатніх пчол, праілюстраванае замалёўкамі, схемамі, фотаздымкамі, звяртаецца ўвага на працэс тэхналагічнага ўдасканалення пчалярства. Значную каштоўнасць ў раскрыцці асаблівасцяў ляснога пчалярства ў палескім рэгіёне, адлюстравання ролі бортніцтва ў сялянскай гаспадарцы беларусаў маюць працы польскіх даследчыкаў Ч. Пяткевіча «Polesia Rzeczyckie. Kultura materialna» (1928), К. Машынскага «Polesie Wschodnie» (1928), Ю. Абрэмбскага «Polesie» (2007). Цікавыя колькасныя дадзеныя па калодным пчалярстве ўтрымлівае IX том навукова–папулярнага выдання «Россия: Полное географическое описание нашего Отечества» (1905). Характарыстыка прамысловых прылад, у тым ліку прадметаў, якія выкарыстоўваюцца ў бортніцтве і калодным пчалярстве, змешчана ў кнізе «Помнікі этнаграфіі: Методыка выяўлення, апісання і збірання» (1981). Пытанні гісторыі ўзнікнення і развіцця бортніцтва, тэхналагічныя аспекты бортнай справы, бортныя прыстасаванні і прылады працы, юрыдычныя аспекты бортніцтва разглядаюцца ў кнізе У. Гуркова і С. Цярохіна – «Бортничество в Белоруссии» (1980). У кнізе «Занятие издревле благородное» (1987) гэтых жа аўтараў прадстаўлена эвалюцыя промыслу ад бортніцтва да рамачнага пчалярства. Асобная ўвага надаецца пчалярству, у тым ліку яго лясной форме, у абагульняючых гісторыка–этналагічных даследаваннях «Материальная культура Полесья» (1968) і «Беларусы. Т. 1: Прамысловыя і рамесныя заняткі» (1995). Істотны ўнёсак у справу вывучэння праблемы гісторыі і сучаснасці беларускага бортніцтва зроблены гісторыкам Зм. Крывашэевым. Яго артыкулы «Беларускае бортніцтва ў ХХ ст.» (2009) і «Успаміны пра заходнебеларускае бортніцтва» (2009) утрымліваюць цікавыя этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя аўтарам напачатку ХХІ ст.

*Мэта артыкула*: разглядзець асноўныя віды выкарыстання лясной прасторы для патрэб пчалярства ў ХХ – пачатку ХХІ ст.; выявіць тэхналагічныя аспекты і гістарычны лёс ляснога пчалярства ў азначаны перыяд, акрэсліць праблемы захавання лясной формы пчалярства на сучасным этапе.

**Асноўная частка.** Пчалярства як культурная форма лесакарыстання ў ХХ – пачатку ХХІ ст. уключае такія асноўныя віды, як бортніцтва, калоднае пчалярства, сезоннае размяшчэнне вулляў у лясным масіве («выпас пчол»), размяшчэнне ў лесе пастак для пчол (вабікаў), сталае размяшчэнне пасек у лесе альбо прылеглай тэрыторыі.

Першапачатковая форма культурнага пчалярства – бортніцтва – грунтавалася на развядзенні і ўтрыманні пчол у борцях, прыстасаваных натуральных альбо спецыяльна выдзеўбаных штучных дуплах у жывых дрэвах, найчасцей такіх, як сасна, дуб і ліпа, а таксама асіна, альха, вярба [2, с.5; 3, s.36; 4, с.20]. Бортнае пчалярства развілася з «дзікага» пчалярства, калі чалавек здабываў мёд са знойдзеных гнёздаў лясных пчол. Дрэва, на якім была выдзеўбана борць, называлася *стайлінай*, калі на адным дрэве размяшчаліся дзве борці, яно называлася *блізняк*, калі тры–чатыры – *матка*,



Полесгу

*каралева*. Для большай устойлівасці хваёвыя бортныя дрэвы нярэдка былі крамлёнымі – са ссечанай вяршыняй – шчыкам [5, с.75].

Выраб борці ўяўляў сабой складаны і працаёмкі працэс, падчас якога выкарыстоўваліся такія плотніцкія інструменты, як барта, пешня (*пяшня*), цясла, лапацень, свярдзёлак (свердзель), долата, скобля, размер, чакуха (*даўбешка*) [6, с.106; 4, с.20]. Спачатку рабілася прамавугольная адтуліна (*доўжня*) памерам 60×14 см з сонечнага боку, праз яе выдзёўбвалася камера борці, якая пасля падчышчалася бартай (*барда, серка, сякера, гак*) – сякерай з шырокім лязом і доўгім тронкам [6, с.106 – 107; 7, с.166]. Задняя, супрацьлеглая доўжні частка борці называлася плячамі. Функцыянальна ў трапецыевіднай па форме камеры борці вылучалася тры часткі: галава (*шапка*), дзе знаходзіўся рой, сярэдзіна – месца для сотаў, дно (*подак, под*) – свабоднае месца пад сотамі, куды ападалі мёртвыя пчолы, markdown розная смецце. Пры неабходнасці на дно ставілі падкормку (падкармячку) – сыту ў драўлянай ці глінянай місачцы [2, с.13]. Пчолы заляталі ў борць і выляталі з яе праз невялікую адтуліну – лятук (*лётка, лётва, вока, ходцы*). Дзеля ўмацавання і адцяжкі пчоламі сот у сярэдзіне борці размяшчалі драўляную крыжавіну (*грабёнка, крыжачок*). Уваходная адтуліна – доўжня (*даўжнік, доўж, лазейка, тварка, века*) – шчыльна замыкалася адна– і двухчасткавым бруском са скошанымі ў сярэдзіне краямі (*доўжань, длужня*). Дадаткова лазейка зачынялася снетам (*снед, снедзь, сняток*) – дошкай, якая прымацоўвалася паверх доўжня пры дапамозе драўляных пальцаў (*спіц*), а таксама магла для ўцяплення прыкрывацца берастой [5, с.73; 7, с.167; 4, с.19].

Каб узабрацца на бортнае дрэва і працаваць на ім, прымянялі *лезіва* і *астроў*. Астроў уяўляў сабой ствол дрэва з не поўнасцю абсечанымі галінамі, па якіх, як па драбіне, падымаліся ўверх. Лезіва (*лазіво, лезіва, плець, пляцёнка, ліпа, гуж, ужышча, жэнь*) – прыстасаванне, асноўная частка якога – сплеценая з палосак сырамяці альбо канапель вяроўка даўжынёй 25 – 30 метраў, з сядзёлкай (*крэсла, лязвеня*) на адным канцы і драўляным круком альбо пятлёй на другім [8, с.164; 3, s.38; 5, с.77]. Паміж імі, бліжэй да сядзёлкі, размяшчалася прыстасаванне для рэгулявання лезіва – казёл.

Паступова са з'яўленнем у XV ст. калоды (пераноснага неразборнага вулля) бортнае пчалярства замянялася калодным, якое па пераемнасці ўспрыняла папярэднюю назву – бортніцтва. У першай чвэрці XIX ст. бортніцтва як традыцыйная форма лесакарыстання страціла былое гаспадарчае значэнне. З сярэдзіны XIX ст. побач з калодай пачаў выкарыстоўвацца разборны вулей з рухомымі рамкамі, але канчатковы пераход да рамачнага пчалярства адбыўся значна пазней.

Бортныя прылады і прыстасаванні заставаліся нязменнымі на працягу стагоддзяў. Перадача прамысловых прылад і прыстасаванняў, а таксама спецыяльных навыкаў і ведаў па тэхналогіі працэсу адбывалася пераважна па спадчыне ў межах адной сям'і. Гэта стала адной з прычын выразнага кансерватызму, які прасочваецца ў беларускім пчалярстве, што ў даследуемы перыяд найбольш выразна выявілася ў першай палове XX ст.

Прамысловая вырубка лясоў XIX ст. стала асноўнай прычынай, па якой пчалярства на тэрыторыі Беларусі ўступіла ў XX стагоддзе ў стане заняпаду. Па тыпу вулляў пчалярская гаспадарка заставалася яшчэ ў большасці сваёй калоднай. У 1914 г. рамачныя вуллі ў беларускіх губернях складалі толькі каля 11 % [9, с.101].

У XX ст. бортніцтва ў сваёй класічнай (першапачатковай) форме сустракалася як рэліктавы від пчалярства. Так, напрыклад, патомны бортнік Б. А. Калеснікаў (в. Рашэтнікі Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці) напачатку XX ст. трымаў 500 пчоласем'яў [9, с.16.]. На знікненне бортніцтва паўплывала аслабленне папуляцый мясцовых лясных пчол (баровак) і скарачэнне іх колькасці, якое адбывалася ва ўмовах панавання бортнага пчалярства ў папярэднія стагоддзі.

Паводле IX тома кнігі «Россия: Полное географическое описание нашего Отечества» (1905), у Мінскай губерні, дзе адзначаўся высокі ўзровень развіцця пчалярства, для сялян гэты занятак з'яўляўся істотнай падмогай у гаспадарцы. Так, напрыклад, у Мазырскім павеце было прададзена мёду і воску на суму 20000 рублёў, а ў Слуцкім атрымана ад продажу прадуктаў пчалярства 14500 рублёў [10, с.255].

Напачатку XX ст. многія беларусы аддавалі перавагу лясной форме калоднага пчалярства. Канструкцыйна калода (*каранік, карэнь, кадаўб, даўбяк, даўбянік, даўбанка, калотка, стаяк, стоўпак, стойнік, ляжак, лежань* [8, с.159; 11, с.414]) адрознівалася ад борці толькі тым, што мела накрыўку з бяросты, яловай ці ліпавай кары, дошак. Для вырабу калоды звычайна выкарыстоўвалі хваёвыя пароды дрэва, найчасцей сасну, а таксама дуб і альху. Калода выраблялася з камля дрэва вышынёй ад 1,10 да 1,65 метра. Па спосабе размяшчэння адносна зямлі калоды бытавалі ў дзвюх формах – вертыкальнай (*стаяк, стаян, стойнік, стоўпак*) і гарызантальнай (*ляжачы вулей, ляжак,*

Полесгу

*лежань*) [6, с.117; 8, с.159–160]. Калоду маглі вырабляць з цэльнага кавалка дрэва, выдзёўбваючы камеру аналагічна, як і ў борці, альбо распілоўвалі камель на дзве часткі, выдзёўбвалі іх, а пасля злучалі і замацоўвалі.

Устанаўліваліся калода альбо на моцнай галіне дрэва, альбо на двух паралельна ўрэзаных у дрэва дубовых брусах, альбо на квадратным памосце вакол дрэва. Гэты памост насіў назву *подкура, адзёра, пасцелі, поткура, адонка, краваці, койкі* і інш. і выкарыстоўваўся ў ахоўных мэтах. Некалькі калод, размешчаных на адным дрэве (памосце), утваралі своеасаблівую лясную пасеку, што было зручна для вядзення пчалярскай справы. Для пад'ёму калоды на дрэва выкарыстоўвалі спецыяльныя прыстасаванні – *кадолы* – дзвюх асноўных канструкцый. Першая мела калаўрот з дзвюма крыжападобнымі ручкамі, другая – кола са спіцамі, за якія круцілі вось пры намотванні вяроўкі [6, с.118]. Узбіраліся на дрэва пры дапамозе лезіва, астрова альбо лесвіцы (*драбіна, леска, страміна, стрэмянка* [8, с.165]).

Інтэнсіўныя прамысловыя лесараспрацоўкі і пашырэнне лесахімічных промыслаў, распрацоўка лясоў пад раллю пры дамінаванні памешчыцкага і дзяржаўнага лесаўладання спрыялі распаўсюджанню пасечнага пчалярства. Перамяшчэнне калодных вулляў з лесу ў вёску адбывалася і ў выніку неспрыяльнай падатковай палітыкі лесаўладальнікаў, якія бралі мядовы падатак з кожнай борці і калоды (напрыклад, у Мазырскім павеце яна складала 30 кап.[12, с.96]) Кампактнае размяшчэнне вулляў з пчоламі спрашчала нагляд за імі, а таксама дазваляла кантраляваць пчол у час раення – адасаблення часткі пчол з маткай. Пасеку (*пчалініц, пчельня*) размяшчалі ў вёсцы непадалёк ад уласнай сядзібы альбо на ўзлеску, у зарасніку. Лясныя пасекі агароджваліся жэрдкамі (*пряслом*), побач магла стаяць невялікая хатка, курэнь альбо будка для захоўвання пчалярскіх інструментаў [13, с. 50]. А. К. Сержпутоўскі бачыў у пасеках пераўжытак ляснай формы пчалярства, у прыватнасці, ляснай пасекі – *поцераба*. На гэта, паказваў той факт, што дрэвы на Палессі з'яўляліся абавязковым атрыбутам пчальнікоў. Больш за тое, калі дрэва, на якім размяшчаўся вулей, ссыхала па нейкай прычыне, то два ці тры разы на тыдзень гаспадар абвешваў яго свежымі зялёнымі галінкамі. У тых выпадках, калі вуллі размяшчалі на слупах альбо полацях, як сам вулей, так і полаці абмотвалі зялёнымі галінкамі [4, с.29].

Новыя спосабы вядзення пчалярскай гаспадаркі, абсталяванне і прылады, у тым ліку рамачныя вуллі ўводзілі ў практыку пчалярскай дзейнасці найбольш заможныя гаспадаркі, у першую чаргу памешчыцкія. Набыццё новых прылад і прыстасаванняў вымагала сродкаў, а авалоданне імі – часу і адпаведных ведаў. Таму для большай часткі сялян яны станавіліся недасяжнымі.

Развіццё пчалярства, па сведчаннях М. Нікіфароўскага, стрымлівалі высокія кошты на пчол: калодны вулей з пчоламі каштаваў ад 1 да 3,5 рублёў [14, с.424–425]. З гэтай прычыны сяляне імкнуліся набыць пчол адпрацоўкай, абменам на гаспадарчыя прадметы, атрымаць у якасці падарунку ці ў спадчыну. Значная ўвага надавалася лоўлі раёў. Для гэтага прымянялі вуллі–пасткі (*стаўка, вабік, лавушка, прыманка, навузнік, раёўня, прыманчывы вулей, каранік*) [8, с.163; 11, с.414], якія выраблялі з дрэва, ліпавай альбо яловай кары. Іх устанаўлівалі ў лесе альбо на дрэвах недалёка ад пасек. Па сваёй канструкцыі драўляныя пасткі нярэдка нагадвалі калодныя вуллі. У некаторых мясцовасцях для лоўлі раёў выкарыстоўвалі пустыя калоды–стаякі. На Віцебшчыне вуллі звонку абмотвалі карой такой пароды дрэва, на якое ў далейшым планавалася дадзеную лавушку ставіць [14, с.CXXX]. Для прываблівання пошукавых пчол (*іск, скаллі, пошук*) з рою, які аддзяліўся, унутраную частку лавушкі выціралі свежым воскам, духмянымі раслінамі (лістамі чорнай парэчкі, ліпавымі галінкамі, мелісай і інш.), унутры пакідалі кавалак сотаў [14, с.425]. Выкарыстоўвалі спецыяльны мядовы адвар – «*напорск*», які гатавалі з вашчыны, пяргі і мёду, дадавалі некалькі духмяных кропляў, напрыклад мятных [13, с.40]. У выпадку кампактнага размяшчэння вулляў на лясной пасецы пчаляр мог назіраць за пчоламі і кантраляваць працэс раення. Калі пчаляр здолеў падпільнаваць выхад пчол на пачатковай стадыі (*высыпка*), схапіць матку і змясціць яе ў матачнік (*матачніца, рашотка, рашатня*) – драўляную каробачку з закратаванымі сценкамі і вечкам, то рой было даволі проста асадзіць і агрэбці ў раёўню [14, с.426]. Для збірання і пераноскі рою выкарыстоўвалі лубовы посуд з палатняным донцам – раёўню (*раёўніца, райніца, раяўня, раёўка, ройнік*) [8, с.167; 5, с.79], альбо іншы посуд, зроблены з лубу або плецены, а таксама рознае хатняе начынне: лупка (лубка), каробка (каробачка), сявенька, кошык, рыбалоўная снасць і інш. [8, с.168]. Калі пасля выхаду рой прысядаў на галінах дрэў, рыхтуючыся да далейшага пералёту, яго апырскваlі (скраплялі) вадой з драўлянай поршневай помпы – сікаўкі (*прыскач, помпачка*) – альбо проста мокрым венікам, пасля аграбалі (*абіралі, чэрпалі*) спецыяльным чарпаком у раёўню. Рой маглі наўпрост стрэсці з галіны ў раёўню, а калі ён размясціўся занадта высока, лавіць з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў на доўгай жэрдцы. У выпадку, калі рой узняўся і

ПолесГУ

адразу скіраваўся да новага месца, яго спрабавалі асадзіць наступнымі спосабамі: званілі ў званочкі, ляскалі косамі, сярпамі, нажамі і нават стралялі з халастых стрэльбаў, імкнуліся акрапіць рой вадой [14, с.426–427].

Паводле этнаграфічных дадзеных, крадзеж мёду і злачынствы ў адносінах да пчалярскай маёмасці ў першай трэці ХХ ст. былі выключна рэдкай з'явай, так як кантраляваліся звычаёвым правам і жорстка караліся вясковай грамадой. [4, с.18]. Паводле матэрыялаў польскага этнасацыёлага Юзэфа Абрэмбскага, найчасцей галоўнымі метадамі ўздзеяння на злачынца былі грамадскае асуджэнне і ганьба: *«bić ne bili, a tolki **wstyd działali**»* [15, с.176], а таксама санкцыі эканамічнага характару. Аднак у выключных выпадках прымянялася і фізічнае пакаранне [15, с.177].

У 1920 – 1930–я гг. стала відавочным, што традыцыйныя метады вядзення пчалярскай гаспадаркі ўжо не будуць такімі эфектыўнымі, як у папярэднія перыяды. На гэта паўплывала перш за ўсё скарачэнне лясных масіваў і медадайных раслін, змяншэнне колькасці лясных пчол. Цяжкія наступствы для ляснога пчалярства мела Першая сусветная вайна. Лясістасць тэрыторыі ў БССР у 1922 г. складала 22 %, што было на трэцюю частку меней за даваенную колькасць лясных масіваў [16, с.54]. Згодна з «Аглядам становішча пчалярства ў Мінскай губерні», прычынамі заняпаду пчалярства, апроч прызыву пчаляроў на вайсковую службу, былі вызначаны рабункі пасек вайскоўцамі: «*Пощады для пчёл не было, замеченные где–нибудь ульи подвергались немедленному разграблению, производившемуся с безжалостным вандализмом*» [17, л.49]. Асабліва вялікія страты пацярпела пчалярства ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях, насельніцтва якіх у гады вайны перасялялася на ўсход. Па прыблізных падліках 1920 – 1921 гг., у Мінскай губерні захавалася толькі 1/10 частка вулляў з пчоламі ад колькасці даваеннага часу [17, л.49]. Статыстычныя дадзеныя 1920 – 1921 гг. пацвярджаюць дамінаванне калоднага пчалярства сярод сялянскага насельніцтва. Так, напрыклад, з ведамасцяў па пчалярскіх пасеках Мінскай губерні вынікае, што ў 1921 г. колькасць калодных вулляў у параўнанні з рамачнымі была ў Мазырскім павеце адпаведна 1443 і 8, у Слуцкім – 1460 і 813 [17, л.238, 79]. У цэлым па БССР у 1925 г. з 136448 вулляў 64% складалі калоды [9, с.103].

У гэты перыяд адносіны ўлад і ўмовы існавання пчалярскай гаспадаркі ва ўсходняй частцы Беларусі былі неадназначнымі. З аднаго боку, разумелася неабходнасць падтрымкі пчаляроў, якая выяўлялася ў селекцыйнай і адукацыйнай дзейнасці, падатковых паслабленнях, «датацыях» цукрам, дрэвам для вулляў і інш. Спецыяльныя заканадаўчыя акты павінны былі замацаваць асаблівы статус пчалярства ў сістэме народнай гаспадаркі (Дэкрэт «Аб ахове пчалярства» 1919 г.). З другога боку, падатковая палітыка савецкай улады (рэквізіцыі, сельскагаспадарчыя падаткі, у тым ліку мядовы) не заўсёды была спрыяльнай для пчаляроў. Значны ўрон пчалярству нанесла раскулачванне, якое закранула найбольш заможныя слаі сялянства, так як уладальнікі вялікіх пасек нярэдка траплялі ў катэгорыю «ворагаў». Палітыка калектывізацыі ў дадзенай сферы была скіравана на стварэнне грамадскіх пасек з рамачнымі вуллямі ў калгасах і саўгасах.

Складанымі былі ўмовы існавання ляснога пчалярства ў 20 – 30–х гг. ХХ ст. у заходняй частцы Беларусі. Інтэнсіўныя прамысловыя лесапрапрацоўкі не спрыялі захаванню старажытнага промысла: палова ўсіх высечаных за 1921 – 1939 гг. лясоў у ІІ Рэчы Паспалітай прыходзілася на Віленскае, Навагрудскае і Палескае ваяводствы [18, с.14]. Як сведчаць этнаграфічныя дадзеныя і матэрыялы тагачаснага друку, большая частка беларускага сялянства Заходняй Беларусі аддавала перавагу калодным вуллям. Так, напрыклад, пчаляр з Наваградскага павета паведамляе ў аддзеле карэспандэнцыі часопіса «Беларуская Борць» (нумар 2/3 за 1934 год) аб дамінаванні калодных вулляў у краі. Што тычыцца прамысловага пчалярства, то яно, як піша аўтар ліста, сустракалася толькі ў фальварках і вялікіх дварах. Складаным для сялян было атрыманне дрэва для вырабу калодных вулляў, яго даводзілася набываць альбо красці ў бліжэйшых прыватнаўласніцкіх лясах. Паводле звестак з Пінскага Палесся, дзе ў міжваенны перыяд сяляне трымалі ў залежнасці ад маёмаснага стану ад 3 – 6 да дзесяткаў калод, з прыходам савецкай улады гаспадары, што мелі найбольшую колькасць вулляў, былі раскулачаны [19].

Яшчэ адным выпрабаваннем для беларускага пчалярства стала Другая сусветная вайна. Скарачэнне лясістасці (у 1945 г. яна зменшылася да 22 %), знішчэнне матэрыяльнай базы пчалярскай гаспадаркі, у першую чаргу вулляў, мелі самыя негатыўныя наступствы для ляснога пчалярства. Разам з тым, лес заставаўся месцам, дзе і людзі, і пчолы мелі шанец на выжыванне. Як сведчаць палявыя запісы, асобныя пчаляры працягвалі ставіць калоды ў лясных масівах падчас вайны і ў пасляваенныя гады [20, л.16]. Так, напрыклад, М. І. Кармановіч з в. Соміна Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці трымаў шэсць калодных вулляў у лесе да 1948 г. [20, л.43].

Полесгу

У пасляваенны перыяд пчалярская гаспадарка была канчаткова пераведзена на пасечную рамачную сістэму ўтрымання пчол. Аднак лясное пчалярства не знікла. У адзінкавых выпадках на тэрыторыі Беларусі сустракалася бортнае пчалярства. І. А. Каршуновіч з в. Прыбалавічы Лельчыцкага раёна, С. Мельнік з в. Санюкі Ельскага раёна Гомельскай вобласці трымалі пчол у борцях яшчэ ў 1954 г. [7, с.169]. У асобных палескіх вёсках калоднае лясное пчалярства было распаўсюджанай з'явай яшчэ ў 50 – 60–я гг. ХХ ст. Сярод прычын адыходу ад калоднага пчалярства патомны пчаляр і краязнаўца з в. Вулька Целяханская Івацэвіцкага раёна А. Р. Сліж адзначае распаўсюджанне ў 1980–я гг. кляшча ваара (Varroa), з якім зручней было змагацца ў рамачным вуллі [20, л.36]. Часам састарэлыя пчаляры пераносілі калоды бліжэй да сядзібы, бо ставіць іх у лесе было цяжка. Размяшчэнне вулляў у вёсцы значна спрашчала догляд за пчоламі.

У пасляваенны перыяд распаўсюджанне набылі вуллі пераходнага тыпу – калоды, перароблены пад рамкі. Падобныя канструкцыі сустракаюцца і ў нашы дні. Самаробныя традыцыйныя прылады і прыстасаванні замяняюцца фабрычнымі вырабамі, якія пчаляры набываюць у спецыялізаваных крамах. Канструкцыйна змяніліся вуллі–пасткі. Яны сталі нагадваць невялікія рамачныя вуллі–домікі. Пасткі практычна перасталі вырабляць з кары. Разам з тым, вуллі калоднага тыпу да сённяшніх дзён выкарыстоўваюць для лоўлі пчол.

Свой уклад у развіццё лясного пчалярства ўнеслі арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі БССР. У 1967 г. у 94 лясгасах налічваліся 162 пчаліныя сям'і, у 1971 г. – 2,5 тысячы, а ў 1975 г. – 6,3 тысячы пчаліных сямей [9, с.112].

На працягу ХХ – пачатку ХХІ ст. развіццё пчалярства як гаспадарчага занятку беларусаў адбывалася з рознай ступенню інтэнсіўнасці па рэгіёнах Беларусі. Шмат у чым гэты працэс залежаў ад лакальных прыродна–геаграфічных умоў і этнакультурнай спецыфікі рэгіёна. Так, напрыклад, захаванне да сённяшніх дзён на Беларускім Палессі калоднага пчалярства ў «лясной» форме, з аднаго боку, было абумоўлена наяўнасцю значных лясных масіваў, а з другога – своеасаблівай ізаляванасцю краю і кансерватыўнасцю яго жыхароў у гаспадарчай дзейнасці. Адметнасць пчалярскай гаспадаркі на Палессі падкрэсліваў Ю. Абрэмбскі: «*Для палешука пасекай выступаў увесь лес, які атачаў вёску,* «*мора лясоў*» [15, s.123].

У 1990–я гг. калоднае пчалярства набыло новы імпульс для адраджэння. У перыяд эканамічнага крызісу некаторыя пчаляры сталі вяртацца да старажытнага промыслу, каб палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. Сярод раёнаў распаўсюджання промыслу трэба асабліва адзначыць Петрыкаўскі, Лельчыцкі і Нараўлянскі раёны Гомельскай вобласці, Столінскі, Пінскі і Івацэвіцкі раёны Брэсцкай вобласці. Асобныя палескія пчаляры і сёння трымаюць па некалькі дзясяткаў калод. Пчаляры аргументуюць сваю прыхільнасць калоднаму пчалярству па–рознаму. Так, паводле адказаў пчаляроў, такая форма практычна не патрабуе выняткаў, калоды перайшлі па спадчыне і пчаляр працягвае сямейную традыцыю, калоды амаль не патрабуюць нагляду і інш. [20, л.3].

Практычна ў кожным лясгасе створаны ўласныя пчальнікі ў лесе альбо непадалёк ад яго. 84 арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі ў межах пабочнага лесакарыстання маюць пчаліныя пасекі, з якіх у 2010 г. было атрымана 45 т мёду, а ў 2011 г. – 61,3 т [21]. Важнай праблемай застаецца недахоп спецыялістаў, якія мелі б адпаведную адукацыю ці, прынамсі, вопыт пчалярства. Колькасць пчоласем'яў і сярэдні выхад мёду з іх вагаецца ў розных лясных гаспадарках.

Значнасць і неабходнасць захавання лясного пчалярства ў нашы дні вызначаецца комплексам гаспадарчых, экалагічных і культурных перадумоў. У апошнія гады актуальнай ва ўсім свеце стала праблема скарачэння колькасці пчол, бо менавіта дзейнасць пчол па апыленні падтрымлівае відавую разнастайнасць на Зямлі, з'яўляецца важнейшым фактарам існавання расліннасці. Уплыў пчол на захаванне лясной флоры, своеасаблівасць і разнастайнасць вышэйшых кветкавых раслін відавочны. Выратаванне і абарона меданосных пчол, развіццё і падтрымка пчалярскай гаспадаркі – як прафесійнай, так і аматарскай – неабходныя не толькі для захавання і ўстойлівага развіцця прыроды, але і для забеспячэння харчовай бяспекі краіны. Арганізацыя дзейнасці ў сферы аховы і падтрымкі калоднага пчалярства – старажытнага беларускага промыслу – з'яўляецца важнай з пункту гледжання захавання этнічнай адметнасці, нацыянальных традыцый, адраджэння і ўзбагачэння беларускай культуры.

Калодныя вуллі і бортны інструмент як помнікі беларускай этнаграфіі прадстаўлены ў гістарычных, краязнаўчых, этнаграфічных музеях Беларусі, пераважна эпізадычна, у фондах і экспазіцыях, прысвечаных народным промыслам і рамёствам (напрыклад, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Музей старажытнабеларускай культуры (ІМЭФ імя К. Крапівы НАН Беларусі, Нараўлянскі этнаграфічны музей, прыватны Музей бортніцтва Мікалая Качаноўскага ў в. Качановічы Пінскага р–на). Разумеючы важнасць і неабходнасць музеефікацыі



Полесгу

аб'ектаў матэрыяльнай культуры, у першую чаргу накіраваную на прадухіленне іх фізічнага знішчэння, варта адзначыць, што праца па выяўленні і зборы прадметаў, звязаных з традыцыйным пчалярствам, вядзецца недастаткова актыўна. Істотнай перашкодай для набыцця прадметаў, звязаных з бортніцтвам і пчалярствам у цэлым, для музеяў з'яўляецца адсутнасць сродкаў на іх закупку, а таксама цяжкасцямі ў іх захоўванні і экспанаванні.

Сёння каля 85 % пчоласем'яў у Беларусі ўтрымліваюць пчаляры–аматары [22]. Згодна з дадзенымі апытанняў аўтара, напачатку XXI ст. самымі актуальнымі праблемамі для беларускіх пчаляроў з'яўляюцца дэфіцыт меданосаў, хімізацыя сельскай гаспадаркі і, як вынік, – зніжэнне колькасці пчаліных сем'яў і вытворчасці прадуктаў пчалярства. Істотнай праблемай з'яўляецца і рэалізацыя ўласнай прадукцыі. Сур'ёзную канкурэнцыю сёння ўтвараюць прывазныя мёд, воск, прапаліс, пылок, якія прывабліваюць пакупнікоў больш нізкімі коштамі. Паводле меркаванняў беларускіх пчаляроў, магчымасці выкарыстання лясных угоддзяў для патрэб пчалярства абмяжоўваюцца парадкам размяшчэння вулляў у лесе (лясны білет, плата за размяшчэнне вулляў і пасек [23, с.343–344]).

**Заключэнне.** У XX – пачатку XXI ст. на змены ў лясным пчалярстве паўплывалі эканамічныя, гістарычныя, тэхналагічныя і экалагічныя фактары. На працягу вывучаемага перыяду адбывалася мадэрнізацыя і рацыяналізацыя пчалярства, што выявілася ў пераходзе ад калоды да рамачнага вулля, размяшчэнні пасек непадалёк ад уласнага жылля, авалоданні і выкарыстанні пчалярамі навуковых дасягненняў і ведаў, іх імкненні да самаадукацыі. У XX ст. на тэрыторыі Беларусі практычна знік такі старажытны від ляснога пчалярства, як бортніцтва. У сваю чаргу, калоднае пчалярства займала даволі трывалыя пазіцыі ў промыславай дзейнасці беларусаў практычна да сярэдзіны XX ст., а ў асобных раёнах Беларусі (у першую чаргу, на Беларускім Палессі) традыцыі калоднага пчалярства працягваюць сваё існаванне да нашых дзён. Сучасныя цэнтры калоднага пчалярства гэта яшчэ і ўнікальны турыстычны аб'ект. Перспектыўнымі захадамі для далейшага захавання і адраджэння старажытнага промыслу бачацца падтрымка беларускіх пчаляроў–аматараў, якія займаюцца калодным пчалярствам, а таксама стварэнне музея бортніцтва з дзеючымі пасекамі ў лясным масіве.

## ЛІТАРАТУРА


1. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. Т. 10: П / НАН Беларусі, Ін–т мовазнаўства імя Я.Коласа; уклад. Р.М. Ралько, М.П. Антропаў, Г.А. Цыхун;. рэд. Г.А. Цыхун. – Мінск : Бел. навука, 2005. – 325 с.
2. Бортничество в Белоруссии / В.С.Гурков, С.Ф.Терёхин. – Минск : Полымя, 1980. – 32 с.
3. Moszynski, K. Polesie Wschodnie / K. Moszynski. – Warszawa: Wyd–wo Kasy im. Mianowskoego, 1928. – 328 s.
4. Сержпутовский, А.К. Бортничество в Белоруссии / А.К. Сержпутовский // Материалы по этнографии России : в 2 т. / Этногр. отд. Рус. музея имп. Александра III ; под ред. Ф.К. Волкова. – М., 1910–1914. – Т. 2. – 1914. – 196 с. С. 13–34
5. Помнікі этнаграфіі: Методыка выяўлення, апісання і збірання / Беларус. Добраахвот. Т–ва аховы помнікаў гісторыі і культуры, Сектар этнаграфіі Ін–та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР; Пад. Рэд. В.К. Бандарчыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 150 с.
6. Беларусы: У 8 Т.1: Прамысловыя і рамесныя заняткі / Рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Піліпенка, В.С.Цітоў. – Мн.: Навука и тэхника, 1995. – 351 с.
7. Полесье. Материальная культура / В.К. Бондарчик, И.Н.Браим, Н.И. Бураковская и др., Редкол.: В.К. Бондарчик, Р.Ф. Кирчив (ответственые редакторы) и др.; АН УССР. Львовское отделение Института искусствоведения, фольклора и этнографии им. М.Ф. Рыльского. – Киев: Наукова думка, 1988. – 488 с.
8. Лексічныя ландшафты Беларусі: Жывёльны свет. – Мн.: Навука і тэхніка, 1995. – 255 с.
9. Гурков, В.С. Занятие издревле благородное: [О равитии пчеловодства в Белоруссии] / В.С. Гурков, С.Ф. Терёхин. – Минск : Полымя, 1987. – 137 с.
10. Россия: Полное географическое писание нашего Отечества. Т. 9. Верхнее Поднепровье и Белоруссия / Под ред. В.П.Семенова. – СПб.: Изд. А.Ф.Девриена, 1905. – 620 с.
11. Слоўнік беларускіх гаворак Паўночна–Заходняй Беларусі і яе пагранічча ў 5 –ці т. Т. 2 Д–Л / [Уклад., Ю.Ф. Мацкевіч, А.І. Грынавецкене, Я.М. Раманавіч і інш.; Рэд. Ю.Ф. Мацкевіч]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 728 с.
12. Титов, В.С. Историко–этнографическое районирование материальной культуры белорусов: XIX – начало XX в. / В.С. Титов. – Минск : Наука и техника, 1983. – 152 с.
13. Романов, Е.Р. Белорусский сборник. Быт белорусса. / Е.Р. Романов. – Вильна: Типография А.Г.Сыркина, 1912. Вып.VIII. – 600 с.
14. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья–бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская типография, 1895.– 552 с.


ПолесГУ

15. Obrębski, J. Polesie / Józef Obrębski. – Warszawa: Oficyna Naukowa, 2007. – 574 s.
16. Багинский, В.Ф. Состояние и перспективы лесопользования в Республике Беларусь // Науковий вісник. – Український державний лісотехнічний університет, 2004. – вип. 14.5. – 1. Лісознавство, лісівництво, лісова наука і освіта. – С. 54–57.
17. Обзор о состоянии пчеловодства в минской губернии, сведения о пасеках по волостям и уездам, переписка с отделами Наркомзема БССР, Харьковским пчеловодным товариществом УССР, уездземотделами по вопросам пчеловодства (1920–1921) // НАРБ. – Фонд 48. – Оп.1. – Д.132.
18. Кухарев, Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919 – 1939 гг.) / Под ред. И.Н. Шемякина. – Мн.: Выш.шк., 1975. – 112 с.
19. Крывашэеў, Зм. Беларускае бортніцтва ў XX ст. / Зм. Крывашэеў. – Радзіма мая – Беларусь. Нацыянальная асветніцка–адукацыйная школа [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://galinaartemenko.livejournal.com/376765.html. – Дата доступа : 14.08.2009.
20. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (АІМЭФ) – Фонд 6. – В. 14. – Спр. 145. Матэрыялы па этнакультурных аспектах лесакарыстання беларусаў, сабраныя ў 2010 г. А.Ю. Бабіч (Брэсцкая вобласць).
21. Министерство лесного хозяйства Республики Беларусь: официальный сайт [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.mlh.by. – Дата доступа : 10.03.2012.
22. Жибуль, Е. Спасти белорусский урожай помогут пчёлы: Круглый стол / Е. Жибуль, В. Куклов // Народная газета. – 08.06.2011. – Дата доступа : 10.03.2012.
23. Кодекс Республики Беларусь о земле. Кодекс Республики Беларусь о недрах. Водный кодекс Республики Беларусь. Лесной кодекс Республики Беларусь. – Минск : Нац. центр правовой информации Респ. Беларусь, 2008. – 393 с.

## BEEKEEPING AS A CULTURAL FORM OF LAND USE BYELORUSSIANS IN THE XX – XXI EARLY CENTURY

***O.YU. BABICH***

***Summary***

Features of one of the traditional forest uses of Belarusians – of beekeeping – are reflected in article. The author traced destiny of the forest beekeeping in Belarus in XX – the beginning of the XXI century on the basis of the analysis of ethnographical materials, historical and anthropological research, archival data, the data of field ethnographical research.

© Бабич А.Ю.

*Поступила в редакцию 26 сентября 2012г.*

Полесгу